**Лекцыя**
**“Узроставыя псіхафізіялагічныя асаблівасці вучняў 4-га класа”**

І ступень – “Маё дзіця- малодшы школьнік ” для бацькоў вучняў IV класа

Дата правядзення 23.10.2021

*Класны кіраўнік IV класа*
*Палякова Таццяна Іванаўна*

У 10 гадоў заканчваецца фарміраванне асноўных новаўтварэнняў малодшага школьнага ўзросту. Апошнія можна параўнаць з фундамантам дома. Таму можна сказаць, што заканчваецца будаўніцтва фундаментальных характарыстык дзіцяці, на аснове якіх будзе прадоўжана развіццё ў падлеткавым узросце. Але трэба мець на ўвазе, што развіццё дзяцей ідзе нераўнамерна з-за асаблівасцей тэмпераменту, тыпу нервовай сістэмы, здароўя, сямейнай сітуацыі і асаблівасцей сямейнага выхавання. Пагэтаму можна гаварыць аб тым, што ў аднаго і таго ж дзіцяці якія-небудзь новаўтварэнні ўжо сфарміраваны, а іншыя знаходзяцца ў стадыі фарміравання, і тут дзіцяці трэба дапамагчы. Перш за ўсё трэба адзначыць фарміраванне адвольнасці пазнаваўчых працэсаў: увагі, памяці.

Наступнае важнае новаўтварэнне – пазнаваўчая рэфлексія: здольнасць усвядоміць прычыны вучэбных няўдач і поспехаў. Далейшае развіццё атрымлівае і асабістая рэфлексія. Дзіця паступова пачынае разумець і дыферэнцыраваць свае асабістыя якасці. У гэтым узросце адбываецца першае ўсведамленне неабходнасці самаразвіцця, іншымі словамі малодшы школьнік ужо можа ўсвядоміць супярэчнасці паміж яго рэальным “Я” і ідэальным, паміж здольнасцямі і магчымасцямі, паміж “магу” і “хачу”, адпаведна зразумець некаторыя аспекты ўнутранай крыніцы савёй актыўнасці. Усвядомленымі становяцца правы і абавязкі дзіцяці. Пры гэтым неабходна, каб ён перастаў рабіць акцэнт толькі на свае правы (“Я так хачу”), што сведчыць аб некаторай сацыяльнай нясталасці, а прыняў неабходнасць выканання сацыяльных абавязкаў. Становіцца ўстойлівай самаацэнка дзіцяці. З’яўляецца магчымасць адэкватна ацэньваць свае заслугі і недахопы. Важна помніць, што ў гэты перыяд у вобраз “Я” уключаецца пачуццё “умеласці, кампетэнтнасці”, гэта значыць усведамленне асабістай магчымасці рабіць даручаную справу добра. У праціўным выпадку магчыма фарміраванне пачуцця глыбокай непаўнацэннасці.

Большую сталасць набываюць зносіны. Калі гаварыць пра зносіны з дарослымі, то трэба мець на ўвазе, што ў гэты час павінна адбыцца дыферэнцыяцыя значымых фігур як звычайных людзей. Пачаткам працэсу дыферынцыяцыі з’яўляецца імкненне дзіцяці заўважыць і абмеркаваць заслугі і недахопы педагога, заканчэннем – уменне параўнаць свайго педагога з

іншымі педагогамі і бацькамі. Аднагодкі становяцца больш значымымі. Іх меркаванне часта пераважае над меркаваннем дарослых. Развіваецца супрацоўніцтва і, як яго перадумова, сацыяльны інтарэс, гэта значыць здольнасць цікавіцца іншымі людзьмі і прымаць у іх удзел.

Актывізуюцца міжпалавыя зносіны. Дзеці аднаго полу могуць разглядацца як праціўнікі. Увага дзяцей супрацьлеглага полу можа прыцягвацца рознымі спосабамі: падаркамі, сваркамі, паддражніваннямі, штуршкамі.

Адбываецца першае ўсведамленне каштоўнасных арыентацый. Дзеці ўсведамляюць розніцу ў сацыяльных статусах, выпрацоўваюць да гэтага асабістыя адносіны. Пачыныюць актыўна развівацца нарматыўныя сацыяльныя страхі: не адпавядаць агульнапрынятым сацыяльным нормам, узорам паводзін (страх зрабіць што-небудзь не так, спазніцца і г.д.), з’яўляецца небяспека перараджэння нармальных страхаў у неўратычныя.

Гэта перыяд “завяршэння дзяцінства – пераходу да дарослацi”, што можа выражацца ў павышэнні эмацыянальнага рэагавання на цяжкасці, у з’яўленні пачуцця адзіноцкасці, адчування асабістай непатрэбнасці.

Чацвёрты год навучання у малодшых класах завяршае першы этап школьнага жыцця дзіцяці. Чацвёртакласнікі – гэта выпускікі пачатковай школы.
Менавіта гэты факт у многім вызначае тыя акцэнты, якія расстаўляюць дарослыя ва ўзаемадзеянні з дзецьмі дадзенага узросту. Перспектыва пераходу усярэдняе звяно застаўляе дарослых звяртаць першаступенную ўвагу на сфарміраванасць у чацвёртакласнікаў вучэбных уменняў і навыкаў.

Да чацвёртага класа ў большасці дзяцей ужо складваецца індывідуальны стыль вучэбнай работы. Агульны падыход дзіцяці да выканання добра праследжваецца пры падрыхтоўцы дамашніх заданняў. Так, напрыклад адны прыступаюць да выканання дамашніх заданняў адразу пасля прыходу са школы, другім патрэбны адпачынак (рознай працягласці). Адны хутка і лёгка ўключаюцца ў работу, у другіх падрыхтоўчы перыяд займае шмат часу. Адны лепш засвойваюць матэрыял з апорай на графічнае адлюстраванне (малюнкі схемы і да т.п.), другія аддаюць перавагу слоўнаму тлумачэнню і г.д.

Адрозненні ў агульным падыходзе да выканання вучэбнай работы звязаны з індывідуальна-тыпалагічнымі асаблівасцямі дзяцей, іх работаздольнасцю, спецыфікай пазнаваўчага развіцця, пераважным тыпам успрымання і перапрацоўкі інфармацыі, неаднолькавым інтарэсам да розных вучэбных прадметаў і г.д.

Індывідуальны стыль вучэбнай работы праяўляецца не толькі ў агульным падыходзе да выканання вучэбных заданняў, але і ў выкарыстанні школьнікамі розных вучэбных уменняў і навыкаў. Валоданне прадуктыўнымі прыёмамі вучэбнай работы азначае, што вучань набыў уменне вучыцца: ён можа якасна засвойваць веды і, у выпадку неабходнасці, здабываць іх самастойна.

Якія ж агульныя ўменні важныя для паспяховага навучання? Сярод іх можна выдзяліць наступныя:

- слухаць настаўніка;
- выдзяляць галоўную думку паведамлення;
- звязна пераказваць змест тэксту;
- адказваць на пытанні да тэксту;
- ставіць пытанні да тэксту;
- рабіць змястоўныя вывады на аснове атрыманай інфармацыі;
- пісьмова выражаць сваю умку;
- прыцягваць дадатковыя крыніцы інфармацыі, карыстацца справачнай інфармацыяй;
- адэкватна ацэньваць вынікі асабістай работы.

Большасць гэтых уменняў абапіраецца на разумовыя здольнасці: уменне параўноўваць і знаходзіць агульнае і адрознае; уменне выдзяляць галоўнае, адрозніваць істотнае ад нязначнага; рабіць лагічныя заключэнні і вывады.

Вучыцца ўсяму гэтаму неабходна ў пачатковай школе, пака аб'ём вучэбнай нагрузкі ў значнай ступені дазіраваны. У сярэдніх класах гэтыя ўменні пакажуцца жыццёва неабходнымі, паколькі значна вырасце колькасць новай інфармацыі, больш складаным стане яе змест. У гэтай сітуацыі метад шматразовага паўтарэння бедзе не эфектыўным. Няўменне правільна працаваць з вучэбным матэрыялам можа стаць прычынай зніжэння паспяховасці, неапраўданагаператамлення вучняў.

Для таго каб зразумець, у якой ступені чацвёртакласнікі валодаюць некаторымі з асноўных прыёмаў вучэбнай работы, можна паназіраць, напрыклад, за тым, як дзіця рыхтуецца да пераказу параграфа па курсе "Чалавек і свет". Ці чытае ён увесь тэкст некалькі разоў запар, стараючыся запомніць усё адразу? Ці чытае ўсяго адзін раз і, не пераказваючы, упэўнены, што ўсё запомніў. Ці засяроджвае ўвагу на змесце асобных абзацаў, не ўстанаўліваючы затым сувязі паміж імі? Ці адказвае на пытанні пасля тэксту? Дзяцей неабходна вучыць працаваць з тэкстам: выдзяляць галоўнае, складаць план і пераказваць з апорай на план іг.д.

Навык звязнага пераказу зручна развіваць не толькі на вучэбным матэрыяле: можна папрасіць дзіця расказаць змест прачытанай кнігі, прагледжанага кінафільма, апісаць падзеі мінулага дня і да т.п.

Да чацвёртага класа ў большасці школьнікаў вызначаецца дыферынцыяцыя вучэбных інтарэсаў, складваюцца розныя адносіны да прадметаў: адны дысцыпліна падабаюцца больш, другія – менш. Перавага тым ці ішым прадметам звязана з індывідуальнымі схільнасцямі і здольнасцямі дзіцяці: некаторым падабаецца матэматыка, у некаторых праяўляюцца лінгвістычныя здольнасці і г.д. А калі ў дзіцяці ніякіх асаблівых здольнасцей не праяўляецца? Псіхалагічныя даследаванні паказваюць, што ні да чога не здольных дзяцей няма. Нават калі дзіця не выдзяляецца сваімі вучэбнымі поспехамі, і на першы погляд, аднолькава абыякава адносіцца да ўсіх прадметаў, ён абавязкова выяўляе схільнасць да лепшага засваення вучэбнага

матэрыялу. Менавіта такія схільнасці, якія паказваюць на больш моцныя стораны развіцця дзіцяці, і неабходна падтрымліваць.

Не трэба таксама забывацца, што жыццё дзяцей не абмяжоўваецца сцянамі школы. За яе межамі дзіця можа быць пагружана ў такія заняткі, якія дазволяць яму праявіць сваё ўменне ў дасягненні поспеху, авалодаць упэўненасцю ў сабе.